## З творчай лабараторыі кераміста

**Сёння беларуская кераміка ўсё часцей звяртаецца да сваіх вытокаў — архаікі. Гэтаму спрыяе сам матэрыял, які звязвае нас з Зямлёй, з прыродай, з гісторыяй.**

# Трансфармацыя манускрыптаў

Керамічны ансамбль "Узвышша", які я прэзентавала сёлета ў якасці дыпломнай працы (кіраўнік — дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Тамара Васюк), складаецца з чатырох скульптур, набліжаных па форме да трапецыі-пірамiды, выкананых у тэхніцы "лепкі са жгутоў". Такая форма скульптур — невыпадковая, бо набліжаецца па сэнсавым змесце да курганоў. На Беларусі вядомыя іх розныя формы, у тым ліку — і чатырохвугольныя, што сімвалізуе і чатыры бакі свету, і поры года, і чатыры фазы сонца. Усё гэта мела сакральнае значэнне для нашых продкаў.

Гэты ансамбль — своеасаблівае ўшанаванне іх старажытнай культуры, носьбітамі якой у нейкай ступені з'яўляемся і мы. Тэхніка "лепкі са жгутоў" сведчыць пра сувязь з архаікай, напамін аб Дрэве жыцця, ці Дрэве Сусвету. Яно заўсёды з'яўлялася своеасаблівым мастком паміж касмаганіяй Неба і касмаганіяй Зямлі. Ва ўяўленнях беларусаў верхняя частка яго належала Богу, святу дабрыні і ведаў. Таму ўсе чатыры скульптуры звужаюцца зверху, сімвалізуючы імкненне ўвышыню.

Сярэдняя частка — гэта прастора жыццядзейнасці чалавека ў "вобразе" паясоў-календароў, нанесеных на скульптуры звонку. Ніжняя частка свяшчэннага дрэва ў народнай міфалогіі суадносілася часам нават з уваходам у Царства памерлых. Сам пласт сімвалізуе навакольны свет, замкнёную прастору гадавога цыкла сялянскай працы, сакральных дзеянняў і прыродны цыкл.

Чатыры падвоеныя паласы, якімі аздоблены пласт, утвараюць сабою крыж — адзін з найстаражытных сакральных знакаў у сусветных міфапаэтычных і рэлігійных сістэмах.

Старажытны народны каляндар нанесены па ўсім дыяметры вырабаў у выглядзе паясоў, нагадвае ўзоры на ручніках. Вядома, што ручнік, як і адзенне, нашы продкі аздаблялі сакральна-абрадавым арнаментам. Увогуле, ён — спадарожнік чалавека ў важных святочных падзеях і штодзённых турботах, старажытны манускрыпт, рукачынная "галубіная кніга" нашай культуры, дзе зашыфраваны генетычны код нашай духоўнасці.

Чатыры курганы-камяні цягнуцца да аднаго цэнтра — цэнтра Сусвету. Яны імкнуцца да Неба, сімвалізуючы сабою Зямлю. Гэта і ёсць мост, перакінуты ад Зямлі да Неба, — Дрэва Сусвету.

**Таццяна ПРАХАРЦАВА,**
**выпускніца**
**БДУКіМ**



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ